**ГУТКА** – вёска ў Баронькаўскім сельскім Савеце (да 1994 г.), за 36 км на ПдЗ ад Касцюковіч, 21 км ад чыгуначнай ст. Бялынкавічы на лініі Крычаў – Сураж, 197 км ад Магілёва.

У 1834 годзе фальварак, 3 двары, 18 жыхароў, уладанне памешчыкаў Сурыновічаў. Па рэвізскіх матэрыялах 1858 г. вёска, 33 жыхары, у валоданні памешчыцы М. Антонавай. Адносілася да Беладубраўскага праваслаўнага прыхода Ражства-Багародзіцкай царквы. Паводле перапісу 1897 г. 13 двароў, 97 жыхароў, у Машаўской вол. Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 14 двароў, 100 жыхароў. У 1920-х г. вёска Гутка-1 (у 1926 г. 18 двароў) і хутар Гутка- 2 (у 1926 г. 2 двары).З сакавіка 1924 года ў БССР, з 17.07.1924 г. вёска ў Мокраўскім сельсавеце Бялынкавіцкага раёна Калінінскай, з 04.08.1927 г. Касцюковіцкага раёна Магілёўскай акругі. У 1930 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас. У Вялікую Айчынную вайну 30.09.1943 г. вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Паводле перапісу 1959 г. – 94, у 1970 г. - 82 жыхары. У 1986 г. 18 гаспадарак, 57 жыхароў. Да 1994 г. вёска была ў складзе саўгаса “Зарэчны”. Планіровачна складалася з кароткай, амаль прамалінейнай вуліцы і забудаванай няшчыльна драўлянымі сялянскімі хатамі. На ўсходняй ускраіне – адасоблены участак забудовы.

У выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС жыхары (18 сямей) пераселены ў п. Крапіўня.